# Марфалагічная інтэрферэнцыя

## Ужыванне дзеяслоўных формаў

Мэта: ***разгледзець асаблівасці ўтварэння і ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў у беларускай мове.***

Задачы:

- ***Прааналізаваць спосабы ўтварэння дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў у беларускай мове.***
- ***Фарміраваць навыкі нарматыўнага ўжывання дзеяслоўных формаў.***

# Дзеепрыметнік –

гэта неспрагальная форма дзеяслова, якая абазначае прымету або ўласцівасць прадмета паводле дзеяння і адказвае на пытанні

які? якая? якое? якія?

***Дысцыпліна - вызначаны парадак паводзін людзей, які адпавядае нормам права і маралі, што дзейнічаюць у грамадстве, а таксама патрабаванням той ці іншай дзейнасці.***

# дзеепрыметнік

## дзеяслоў

трыванне
стан
час

## прыметнік

род
лік
склон

| | Прошлы час | Цяперашні час |
|---|---|---|
| Незалежны стан | -л- - збялелы<br>-ш- - падросшы<br>-ўш- -маўчаўшы | -уч-(-юч-)-1 спр.<br>кіруючы<br>-ач-(-яч-)-2 спр.<br>гаворачы |
| Залежны стан | -н- - знесены<br>-ен- - прынесены<br>-ан- - замазаны<br>-т- - забыты | -ем- - 1 спр.<br>- кіруемы<br>-ім- - 2 спр.<br>- цярпімы |

**Заданне:** ***Ад наступных дзеясловаў утварыць уласцівыя беларускай мове дзеепрыметнікі***

- Абнавіць
- Выдаць
- Выбіць
- Выпісаць
- Парушаць
- Патрабаваць
- Гандляваць

# *Ужыванне дзеепрыметнікаў*

# Для беларускай мовы не характэрны зваротныя дзеепрыметнікі (з постфіксам -ся)

Водолаз, опустившийся на дно моря.

Надежды, не сбывшиеся в молодости.

Дом, строящийся на пустыре.

# Заданне. Перакладзіце на беларускую мову дзеепрыметнікі.

| | |
|---|---|
| Прочитанный | Проданный |
| Натренированный | Розданный |
| Созванный | Созданный |
| Сформулированный | Затоптанный |
| Откопанный | Завершённый |
| Расшифрованный | Организованный |

1. *Каждый* ***входящий*** *со двора вносил с собой свежесть и запах мягкого снега.*

(В. Короленко)

1. *Кожны,* ***хто ішоў са двара****, уносіў з сабою свежасць і пах мяккага снегу.*

(Пераклад Я. Шарахоўскага)

**2. *Вдали глухо, точно из-под земли, слышался все возрастающий грохот*.**

**(И. Бунин)**

**2. *Удалечыні глуха, як з-пад зямлі, чуўся ўсё большы і большы грукат*.**

**(П-д Я. Скрыгана)**

***3. Я увидел в конце поля что-то большое, черное и услышал*** ***доносившиеся*** ***оттуда*** ***звуки*** ***флейты и барабана.***

**(Л. Толстой)**

***3. Я ўбачыў у канцы поля нешта вялікае, чорнае і*** ***пачуў адтуль гукі*** ***флейты і барабана.***

**(П-д Я. Брыля)**

4. Мишка оглядывался на машину с работающим мотором.

(Ю. Казаков)

4. Мішка азіраецца на машыну з нявыключаным маторам.

(П-д Я. Скрыгана)

**5. *Я вижу, как* Наденька *выходит* на *крылечко и устремляет* печальный, *тоскующий взгляд* на небо.**

**(А. Чехов)**

**5. *Я бачу, як* Надзейка выходдзіць на ганак і *журботна, тужліва глядзіць у неба*.**

**(П-д Я. Шахаўца)**

6. Мне казалось, что эти полусонные люди не способны к работе, не спасут погибающий груз. (М. Горький)

6. Мне здавалася, што гэтыя напалавіну сонныя людзі не здольны да працы, не выратуюць ад пагібелі груз.

(П-д Я. Брыля)

**7. Свежий, *прохватывающий ветерок* тянул с запада, и светлый *туман, как пар, поднимался* над *шумящей рекой*.** **(Л. Толстой)**

**7. Свежы, *пранізлівы ветрык* цягнуў з захаду, і светлы туман... падымаўся над *гаманлівай ракой*.** (П-д Я. Шарахоўскага)

**8. Это была хорошенькая девочка, маленькая, полненькая, румяная, с веселыми карими глазками, с вечной улыбкой на красных губках, вечно смеющаяся и болтающая.**

**(Л. Толстой)**

**8. Гэта была прыгожанькая дзяўчынка, маленькая, пухленькая, ружовая, з вясёлымі карымі вочкамі, з заўсёднай усмешкай на чырвоных вуснах; яна заўсёды смяялася і балбатала.**

**(П-д А. Кучара)**

**Дзеепрыслоўе** – няменная форма дзеяслова, якая абазначае дадатковае дзеянне пры галоўным слове, выражаным дзеясловам-выказнікам

***За дубамі ўзвышаюцца, гамонячы сваімі калматымі вершалінамі з сінім небам, вечназялёныя елі і сосны.***

# дзеепрыслоўе

- дзеяслоў
  - трыванне стан
- прыслоўе
  - нязменныя

–ўшы
пасля галосных

| Незакончанае трыванне | Закончанае трыванне |
|---|---|
| 1 спр.<br>–учы (-ючы)<br>набываючы<br>2 спр.<br>–ачы (-ячы)<br>гаворачы | пасля галосных<br>–ўшы<br>сказаўшы<br>пасля зычных<br>–шы<br>перамогшы |

## Заданне 1. Ад наступных дзеясловаў утварыце дзеепрыслоўі незакончанага трывання.

| | |
|---|---|
| Набываць | набываючы |
| Гандляваць | гандлючы |
| Забяспечваць | забяспечваючы |
| Адпавядаць | адпавядаючы |
| Заахвочваць | заахвочваючы |
| Кіраваць | кіруючы |

## Заданне 1. Ад наступных дзеясловаў утварыце дзеепрыслоўі закончанага трывання.

| | |
|---|---|
| Сустрэць | сустрэўшы |
| Паабяцаць | паабяцаўшы |
| Заўважыць | заўважыўшы |
| Упэўніцца | упэўніўшыся |
| Дапамагчы | дапамогшы |
| Агледзець | агледзеўшы |

# Ужыванне дзеепрыслоўяў

**Перечитывая** *эту страницу, я замечаю, что далеко отвлёкся от своего предмета*

(М. Лермонтов)

**Перачытваючы** *гэтую старонку, я...*

Грушницкий, **увидев** меня издали, подошёл ко мне

(М. Лермонтов).

Грушніцкі, **убачыўшы** мяне здалёк, падышоў да мяне.